Менавіта таму ў студэнтаў спецыялізацый «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія дзіцячай літаратуры» і «Бібліятэкар, настаўнік беларускай мовы і літаратуры» неабходна выхоўваць і развіваць педагагічныя здольнасці. Да іх ліку ў першую чаргу адносяцца здольнасць перадаваць дзецям веды у кароткай і цікавай форме; здольнасць разумець дзяцей, якая базіруецца на назіральнасці; самастойны і творчы склад мыслення; знаходлівасць, арганізатарскія здольнасці (Н.Д.Левітаў); камунікатыўная здольнасць (Н.В.Кузьміна).

Не адмаўляючы важкасць усіх састаўляючых педагагічных здольнасцей, мы лічым, што асаблівую значнасць пры сучаснай прафесійнай падрыхтоўцы бібліятэкара набывае праблема фарміравання камунікатыўных здольнасцей. Безумоўна, ад таго, якое ўражанне складаецца ў чытача ад камунікатыўнай культуры бібліятэкара, у многім залежыць эфектыўнасць далейшай работы.

Выяўленне і ўдакладненне чытацкіх запатрабаванняў адбываюцца ў час індывідуальных зносін (або камунікатыўнай сітуацыі) бібліятэкара з чытачом. Гэтыя зносіны могуць быць непасрэднымі і апасродкаванымі. У непасрэдных зносінах з чытачом сапраўды таленавіты, творчы бібліятэкар-педагог выкарыстоўвае імправізацыю, шчырасць, характар жывой гутаркі.

Камунікатыўная культура бібліятэкара, на наш погляд, абавязкова павінна грунтавацца на веданні эмацыянальнай сферы чалавека. У дачыненні да дзіцячага чытача бібліятэкар павінен адчуць свет яго перажыванняў, умець чуць і слухаць дзіця, падтрымаць шматгранныя, эмацыянальныя зносіны з ім. Безумоўна, гэта ў сваю чаргу будзе садзейнічаць выхаванню пачуццяў дзяцей, бо менавіта «ў дзяцінстве чалавек павінен прайсці эмацыянальную школу - школу выхавання добрых пачуццяў» (В.А.Сухамлінскі). У гэтых умовах асобае значэнне набывае прынцып супрацоўніцтва, сатворчасці, душэўнага кантакту, які нельга звесці толькі да якой-небудзь сумы ведаў або тэхналагічных працэсаў.

Разам з тым дзеля фарміравання гэтых здольнасцей студэнтам неабходна атрымаць адпаведныя навукова-тэарэтычныя веды і практычныя навыкі ў працэсе навучання. Гэтаму ў значнай ступені будзе садзейнічаць напісанне дыпломных, курсавых работ, у якіх будуць разглядацца псіхолага-педагагічныя аспекты развіцця дзіцяці ў пэўным ўзросце, псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання розных відаў і жанраў літаратуры, інфармацыйнага тэксту і г.д. Вывучэнне камунікатыўных аспектаў бібліяграфічнай дзейнасці можа адбывацца таксама на лекцыях, калёквіумах, семінарскіх, лабараторных занятках творчага характару (складанне бібліяграфічных дапаможнікаў, анатаванне дзіцячай мастацкай і навукова-пазнавальнай літаратуры, правядзенне дзелавых гульняў), на якіх аптымальна спалучаюцца тэарэтычныя і практычныя ўстаноўкі вучэбнага працэсу, ствараюцца ўмовы для актыўнага мыслення, замацавання ведаў, праяўлення творчых здольнасцей студэнтаў.

Фарміраванню камунікатыўных здольнасцей студэнтаў вышэйназваных спецыялізацый будзе садзейнічаць, на нашу думку, выкладанне спецкурса «Камунікатыўная культура бібліятэкараў дзіцячых бібліятэк». Вызначыць жа патэнцыяльныя магчымасці фарміравання гэтых здольнасцей у абітурыентаў дапаможа своеасаблівы тэст, які дазволіць выявіць схільнасці будучага бібліятэкара да працы з дзецьмі.

Суддзя Э.С.,
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНЫХ ПАТРЭБ У ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Аптымальнае працяканне працэсу развіцця пазнавальных патрэбнасцей студэнтаў дасягаецца тады, калі галоўным у пазнавальнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці з'яўляецца не проста засваенне пэўнай інфармацыі, а мэтазгоднае творчае засваенне набыткаў практыкі. На сучасным этапе без інфармацыі, першакрыніц, разумення традыцый, вывучэння сацыяльна-эканамічных умоў сваёй і іншых краін немагчыма паспяховае развіццё пазнавальнай дзейнасці. На жаль, да гэтага часу праблемы атрымання неабходнай інфармацыі ў многім не вырашаны, што ўплывае адмоўна на ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва ў рамках адкрытага грамадства.

Навукова-інфармацыйная дзейнасць накіравана на аптымальнае выкарыстанне інфармацыі шляхам яе ўпарадкавання, структурыравання і арганізацыі функцыяніравання ў інфармацыйных сістэмах. Інакш кажучы, навукова-інфармацыйная дзейнасць з'яўляецца састаўной часткай даследчай дзейнасці як асноўнага віду пазнавальнай дзейнасці. Такім чынам, студэнт павінен ведаць, што ў працэсе інфармацыйнай дзейнасці рэалізуецца не толькі функцыя ўздзеяння на навуковы працэс, але і фарміруюцца ў навуцы /у тым ліку і ў бібліяграфазнаўстве агульным ці галіновым/ уласныя інфармацыйныя структуры, якія садзейнічаюць узаемадзеянню яе раздзелаў, інтэграцыі розных галін навукі, узаемасувязі навукі з практыкай і інш.

На высвятленне гэтых сувязей і накіравана ўся методыка выкладання курсаў "Бібліяграфія мастацтва" і "Бібліяграфія мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства".

Пазнавальная патрэбнасць функцыянальна абумоўлена характарам мэтавай дзейнасці студэнта і таму з'яўляецца вытворнай функцыяй гэтай дзейнасці. Стварэнне любых сітуацый, якія стымулююць узнікненне патрэбнасцей інфармацыі,-- істотны фактар кіравання фарміраваннем гэтага віду духоўных патрэбнасцей. Дадзеная думка пранізвае ўсе віды заняткаў: лекцыі, семінары, лабараторныя і розныя формы кантролю.

Неабходна адзначыць, што роля навукова-інфармацыйнай дзейнасці студэнта ўзрастае з кожным годам, але ў той жа час колькасць гадзін на вывучэнне такіх дысцыплін, як "Бібліяграфія мастацтва" і "Бібліяграфія мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства", скарачаецца.

У сувязі са спецыфікай навучання на завочным факультэце набыццё навыкаў навуковага даследавання мае большае значэнне, чым на дзённым, бо цэнтр навучання студэнтаў-завочнікаў перамяшчаецца на іх самастойную працу з падручнікам, спецыяльнай літаратурай. Больш таго, без такіх навыкаў немагчыма нават элементарнае засваенне курса. У адпаведнасці з гэтым арганізацыя праверкі ведаў студэнта на экзамену ці заліку павінна ўлічваць нацэленасць на выпрацоўку гэтых навыкаў. Пры гэтым студэнты папярэджваюцца аб неабходнасці іх набыцця.

Аналіз і правільны ўлік апэначнай інфармацыі можа аказаць значную дапамогу пры адборы інфармацыйных звестак для распаўсюджання ў залежнасці ад характару выконваемай работы, у выбары формаў і метадаў перадачы інфармацыі. Пры правядзенні дзелавай гульні гэта праяўляецца вельмі добра.

Фарміраванню пазнавальных патрэбнасцей садзейнічае максімальнае выкарыстанне студэнтамі магчымасцей навукова-інфармацыйнай дзейнасці праз напісанне курсавых, дыпломных і навуковых прац. Садзейнічае гэта таксама ўдасканаленню іх асабістай інфармацыйнай культуры.

Павышэнне адукацыйнага і культурнага ўзроўню студэнтаў, развіццё іх навуковай творчасці ўздзейнічаюць на дынамізм, глыбіню і тэмпы грамадскіх пераўтварэнняў, сацыяльны эфект спажывання інфармацыі.

Студэнты ў час вытворчай практыкі ў бібліятэцы часта выяўляюць адсутнасць навыкаў апрацоўкі і сістэматызацыі неабходнай ім навукова-метадычнай інфармацыі, уменняў аналізаваць свой і іншых вопыт работы, рабіць прафесійныя вывады. На наш погляд, выпраўленню названых недахопаў могуць садзейнічаць укараненне тэставых кантрольных заданняў, рэфератаў-аглядаў. Лепшыя з іх маглі б быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапанаваны навуковаму аддзелу інфармацыі па культуры і мастацтву Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі для публікацыі.

Усё сказанае ў сукупнасці дапаможа развіццю пазнавальных здольнасцей студэнтаў і падрыхтоўцы іх да шматграннай навукова-даследчай і інфармацыйнай дзейнасці.

**Ільіна Н.Р.,**
ст. выкладчык

## СПЕЦКУРС «ПАЭЗІЯ І МУЗЫКА» ЯК ФОРМА РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Пытанне аб развіцці здольнасцей цесна звязана з агульнай праблемай развіцця асобы чалавека. У адпаведнасці з думкамі навукоўцаў, здольнасці -- гэта такія псіхалагічныя асаблівасці чалавека, ад якіх залежыць набыццё ведаў, звычак, уменняў, але якія самі да гэтых ведаў, звычак не зводзяцца.

Разгляд суадносін задаткаў і здольнасцей паказвае: нягледзячы на тое, што развіццё апошніх залежыць ад прыродных перадумоў, якія далёка не аднолькавыя ў розных людзей, здольнасці не толькі дар прыроды, але і прадукт чалавечай гісторыі. Значыць, праяўленне здольнасцей знаходзіцца ў прамой залежнасці ад канкрэтных прыёмаў фарміравання ведаў і ўменняў.

Калі гаварыць аб структуры творчых здольнасцей, можна вылучыць такія якасці, як пільнасць, сабранасць, гатоўнасць да напружанай працы. Акрамя таго, творчай асобе ўласцівы хуткасць мысліцельнага працэсу, вялікія магчымасці аналізу і абагульнення. Усе гэтыя якасці мы можам разгортваць і ўдасканальваць. У дасягненні гэтай мэты нам дапамагаюць розныя формы работы і методыкі.

Так, напрыклад, спецкурс «Паэзія і музыка», які быў уключаны ў праграму падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне», выявіў, што на занятках можна рашаць праблемы, звязаныя з развіццём творчых здольнасцей студэнтаў.

Лекцыйны курс, уключаючы цікавую інфармацыю аб творчасці такіх паэтаў, як С.Ясенін, А.Блок, В.Мандэльштам, М.Цвятаева і інш., аб іх адносінах са светам музыкі, абуджае творчую думку і ўяўленне студэнтаў, прымушае лепш зразумець прыроду творчасці. У сваю чаргу, вобразы, створаныя паэтамі, прымушаюць працаваць фантазію студэнтаў. А фантазія, як мы ведаем, выступае неабходным элементам творчай дзейнасці ў мастацтве і літаратуры. Праз лекцыйны і практычны матэрыял мы дамагаемся таго, каб уключыць у работу ўяўленне студэнтаў. Вядома, што вельмі важная асаблівасць уяўлення, якое ўдзельнічае ў творчай дзейнасці будучага мастака, спевака, -- яго эмацыянальнасць. Вобраз, сітуацыя, нечаканы паварот сюжэта, якому мы вучым суперажываць студэнта, прапускаючы праз сваё роду прыстасаванне, якім служыць эмацыянальная сфера творчай асобы.

Семінарскія заняткі праводзіліся такім чынам, што далі магчымасць студэнтам лепш раскрыць свае здольнасці. Напрыклад, выконваліся музычныя і паэтычныя творы, якія стварылі самі студэнты. Пасля праслухоўвання праходзілі абмеркаванне і аналіз твораў. Для спецкурса быў запісаны фанаграфічны матэрыял, які дазволіў адчуць непарыўнае адзінства музычнага гуку і паэтычнага слова.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што спецкурсы дапамагаюць у вырашэнні задачы развіцця творчых здольнасцей студэнтаў. Па-першае, яны прызначаны для студэнтаў, якія ўсвядомілі свае інтарэсы ў плане будучай прафесійнай дзейнасці; па-другое, дакладна акрэслены круг тэм і дробнагрупавыя заняткі дазваляюць дасягаць больш значных поспехаў. І, па-трэцяе, мы ў нейкай меры даем магчымасць студэнтам рэалізаваць свае мары, таму што мара -- гэта неабходная ўмова рэалізацыі творчых магчымасцей чалавека. У сувязі з гэтым хочацца ўспомніць словы Д.І.Пісарава, які гаварыў аб мары, як аб штуршку да працы: «Калі б чалавек зусім не меў здольнасці марыць, тады б я ніяк не мог уявіць, якая пабуджальная прычына прымусіла б чалавека

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ